ваць новыя пласты філасофска-сацыялагічных ведаў, адклікацца на новыя яшчэ не вырашаныя пытанні. Як асоба творчая, ён валодае незвычайнай навуковай інтуіцыяй, глыбінным разуменнем сацыяльнай значнасці выклікаў часу, якія пастаянна ўзнікаюць у грамадскім жыцці. Яго сутнасна-грамадзянская пазіцыя не дазваляе быць абыякавым да небяспечных і складаных працэсаў і падзей, ён з дзяржаўнай адказнасцю бярэцца за іх навуковае вырашэнне. Яскравым сведчаннем таму з'яўляюцца падрыхтоўка і выданне грунтоўнага манаграфічнага даследавання «Катастрофы: социологический анализ»[1].

Чарнобыльская трагедыя, якая абрынулася на беларускую зямлю ў 1986 годзе, не толькі выклікала радыеактыўнае забруджванне тэрыторыі, але і парадзіла ў грамадстве шэраг сацыяльных, медыцынскіх і псіхалагічных праблем. Беларускае грамадства перажывала і недавер да афіцыйных крыніц інфармацыі, і спробы замоўчвання існаваўшых пагроз для чалавека вынікаў чарнобыльскай катастрофы, што нараджала розныя чуткі і распаўсюджанне разнастайных «смажаных» фактаў і фобій, якія выклікалі жаданне верыць у іх. Наступствы чарнобыльскай катастрофы ўзрушылі ўсе слаі грамадства, аказалі моцны ўплыў на індывідуальнае і грамадскае светаўспрыманне, на паўсядзённыя паводзіны сотняў тысяч людзей. Быў парушаны не толькі звыклы лад жыцця людзей – адбылася ломка жыццёвых установак і каштоўнасных арыентацый. Негатыўны ўплыў аказвалі і вымушаны разрыў усталяваных сацыяльных сувязяў і змена традыцыйнага ладу жыцця. Вялікія перажыванні цярпелі не толькі тыя, хто застаўся на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях, але і тыя, хто перасяліўся на новае месца жыхарства.

Паўстала аб'ектыўная неабходнасць асэнсавання гэтага феномена. Адным з першых, хто прыступіў да тэарэтычнага асэнсавання праблем катастроф, быў Я. М. Бабосаў. Абапіраючыся на навукова-тэарэтычныя працы еўрапейскіх і расійскіх даследчыкаў, ён разгарнуў актыўную працу па збіранні факталагічных матэрыялаў для навуковага вырашэння праблемы. Перад сабой аўтар паставіў няпростую мэту сацыяльна-філасофскага аналізу катастрафічных сітуацый і іх шматузроўневага ўздзеяння на паводзіны чалавека, яго лад жыцця, каштоўнасныя арыентацыі і ўстаноўкі. Для вырашэння гэтай складанай задачы былі прааналізаваны розныя экстрэмальныя сітуацыі і катастрофы: глабальныя, рэгіянальныя і лакальныя, прыродныя, антрапагенныя, экалагічныя, тэхналагічныя, сацыяльныя. Паглыблены аналіз трагедый і катастроф дапамог аўтару выявіць сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці паводзін людзей у экстрэмальных сітуацыях, а таксама цывілізацыйныя механізмы адаптацыі сацыяльных супольнасцей і індывідаў да катастрофных і посткатастрофных працэсаў.

У навуковым даследаванні Я. М. Бабосава былі не толькі асэнсаваны сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці паводзін людзей у эстрэмальных умовах, але і абгрунтаваны ўплыў катастроф і посткатастрофных працэсаў на развіццё

[1] *Бабосов Е. М.* Катастрофы: социологический анализ. Минск, 1995.

сацыяльных канфліктаў. У манаграфічным даследаванні зроблены шэраг практычных рэкамендацый, як павінен паводзіць сябе чалавек у экстрэмальнай сітуацыі, абгрунтавана важнасць прыняцця правільных кіраўніцкіх рашэнняў для мінімізацыі вынікаў трагедый, звернута ўвага на папярэджанне і прадказанне бедаў і катастроф і шляхі выхаду з іх у творчасці сусветнай культуры[1].

Сёння, напярэдадні 30-й гадавіны трагедыі чарнобыльскай катастрофы, творчыя здабыткі вучонага набываюць надзвычайную актуальнасць. З вышыні часу больш выразна бачацца не толькі пераадоленне наступстваў трагедыі, але і пралікі, і памылкі, якія дазваляюць больш глыбока асэнсоўваць перамены, якія адбыліся ў грамадскім пераадоленні постчарнобыльскага сіндрому.

Гістарычны вопыт сведчыць, што стыхійныя бедствы суправаджаюць чалавека спрадвеку. На жаль, у нашы дні мы ўсё часцей сустракаем паведамленні аб стыхійных і тэхнагенных бедствах. Падзеі апошніх дзесяцігоддзяў паказваюць, што людзі баяцца прыродных стыхій, многія не гатовыя да сустрэчы з імі, што прыводзіць да вялікіх трагедый. Напрыклад, у 2010 годзе загінула каля 260 000 чалавек, што ў 17 разоў больш, чым у 2009 годзе. Найбольш катастрафічным сусветным бедствам у 2010 годзе з’явілася землятрасенне на Гаіці, калі загінула 223 000 чалавек, а 1 200 000 жыхароў засталіся без даху над галавой. Самым катастрафічным для біясферы за ўвесь час існавання чалавецтва лічыцца ўзрыў на нафтавай платформе ў Мексіканскім заліве ў 2010 годзе. Нафтавая плёнка пакрыла плошчу, роўную сямідзесяці пяці тысячам квадратных кіламетраў у Мексіканскім заліве. Найбольш страшнай экалагічнай катастрофай на тэрыторыі былога СССР лічыцца гібель Аральскага мора. Гэты пералік можна працягваць доўга. Многія вучоныя прыйшлі да высновы, што шматлікія трагедыі і бедствы, катастрофы і надзвычайныя сітуацыі сведчаць аб знаходжанні чалавецтва ў няўстойлівай стадыі свайго развіцця, у так званай кропцы біфуркацыі. Некаторыя аналітыкі небеспадстаўна сцвярджаюць, што размова ідзе па вялікім рахунку аб тупіку, куды ў сваім развіцці зайшла «рынкава-спажывецкая цывілізацыя». Узмацненне тэхнагеннай нагрузкі на прыроднае асяроддзе і самога чалавека прыводзіць да рэзкага ўзрастання колькасці экстрэмальных сітуацый, аварый і катастроф. Адначасова з павелічэннем колькасных параметраў экстрэмальных сітуацый рэзка інтэнсіфікуюцца іх якасныя характарыстыкі – прыкметна ўзрастаюць адмоўныя ўздзеянні на чалавека, якія прыводзяць да парушэння яго здароўя, сацыяльнага дабрабыту і нават гібелі.

Акрэсленае яскрава сведчыць аб неабходнасці пастаяннага вывучэння трагедый, катастроф і надзвычайных сітуацый. Чым больш мы будзем ведаць пра катастрофы, чым больш дакладнымі і глыбокімі будуць нашы веды, тым лепш грамадства і людзі змогуць спраўляцца з будучай бядой у экстрэмальных сітуацыях. А колькасць трагічных сітуацый, як ужо адзначалася, нарастае

---

[1] *Бабосов Е. М.* Катастрофы: социологический анализ. С. 226–298.

імклівымі тэмпамі. Таму комплекснае, шматпланавае, прычым міждысцыплінарнае даследаванне катастроф ва ўсёй іх разнастайнасці павінна нарэшце быць інтэгравана ў якасці кампанента ў сістэму ведаў пра чалавека, грамадства і прыроду. Менавіта аб гэтым вядзе размову акадэмік у сваім манаграфічным даследаванні. Ён справядліва сцвярджае, што паколькі ахвярай катастроф, а нярэдка і ініцыятарам іх узнікнення з'яўляецца перш за ўсё чалавек, у «міждысцыплінарнай сістэме ведаў аб катастрофах – катастрафалогіі – прыярытэтнае месца павінна належаць выяўленню асаблівасцяў паводзін людзей, іх груп і супольнасцяў у экстрэмальных сітуацыях катастроф і посткатастрофнага перыяду. Важная роля ў гэтым належыць спецыфічнай сферы сацыякультурнага развіцця чалавецтва – субкультуры катастроф, закліканай выпрацоўваць у людзей нормы паводзін, каштоўнасныя арыентацыі, крытэрыі ацэнак учынкаў і дзеянняў як у перадкатастрофны перыяд, так і асабліва ва ўмовах катастроф і пераадолення іх сацыяльна негатыўных наступстваў»[1].

У даследаванні Яўген Міхайлавіч справядліва сцвярджае, што ў практычнай дзейнасці грамадства павінна абапірацца не толькі на ўжо наяўныя веды аб катастрофах, на абагульненне гістарычнага вопыту чалавецтва ў барацьбе са стыхійнымі прыроднымі і разбуральнымі сацыяльнымі бедствамі, але і на сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі. Яны ўжо сёння дазваляюць даследчыкам будаваць мадэлі і разглядаць магчымыя варыянты паводзінаў пры прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў пры ўзнікненні катастроф і сацыяльных бедстваў. Неабходна больш актыўна і глыбока аналізаваць катастрафічныя сітуацыі, каб не толькі пазбавіць чалавецтва ад страху перад магчымымі катастрофамі, але і навучыць грамадства рыхтавацца да катастроф, каб хутчэй, больш эфектыўна і дакладней прадказваць магчымасці, месца і час іх узнікнення, а самае галоўнае – мінімізаваць іх адмоўныя наступствы. Тым самым будзе зніжаны патэнцыял катастрафічных паводзін, існуючы ў сучасным грамадстве, а само яно апынецца больш падрыхтаваным да таго, каб калі і не прадухіліць магчымыя катастрофы, то рэзка знізіць шкоду ад іх»[2].

Праз усю працу праводзіцца думка, што неабходнай перадумовай для абароны ад прыродных катастроф з'яўляецца пазнанне прычын і механізму іх узнікнення. Разумеючы сутнасць катастрафічных з'яў і працэсаў, можна знайсці падыходы да іх прагнозу і правядзення ахоўных мерапрыемстваў, якія значна паменшаць іх наступствы. Каб пазбегнуць прыродных катастроф, зменшыць іх адмоўны ўплыў на развіццё грамадства, чалавеку неабходна ўлічваць усю разнастайнасць прыродных і сацыяльных працэсаў, якія ўздзейнічаюць на рытміку Зямлі і яе біясферу, што на сучасным узроўні развіцця навукі цалкам рэальна. Для паспяховага вырашэння шэрагу глабальных праблем чалавецтва павінна радыкальна перагледзець свой погляд на ўзаемаадносіны з прыродай. Прырода цярплівая, але яе цярпенне не бясконцае.

[1] *Бабосов Е. М.* Катастрофы: социологический анализ. С. 454–455.

[2] Тамсама.

Як бачна, багаты творчы вопыт, грамадзянская пазіцыя, сацыяльная адказнасць, памножаныя на зайздросную працаздольнасць, садзейнічалі асэнсаванню Я. М. Бабосавым вялікага пласта матэрыялаў, звязаных з тэхнагеннай аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, і паспяховаму выкананню на высокім прафесійным узроўні навукова-даследчай працы вялікай грамадскай вартасці. Зробленыя ім навуковыя выкладкі не толькі ўзбройваюць навуковую і грамадскую думку новымі падыходамі і ацэнкамі, але з'яўляюцца карыснымі для прыняцця практычных рашэнняў. Многія выкладзеныя ў манаграфіі ацэнкі зроблены на падставе глыбокага аналізу самых разнастайных матэрыялаў і глыбокага разважання даследчыка, яны не страчваюць сваёй сацыяльнай і навуковай значнасці і сёння.

Нельга не звярнуць увагі на навуковыя даследаванні Я. М. Бабосава, у якіх ён звяртаецца да праблем беларускай нацыянальнай ідэі і фарміравання беларускай дзяржаўнасці, якія востра паўставалі на рубяжы XX–XXI стагоддзяў. Вастрыня адчування складанага і супярэчлівага шляху беларускага народа асабліва выразна прагучала ў манаграфіі Я. М. Бабосава «Основы идеологии современного государства», у якой беларускае грамадства паўстае як цэласная, складана-структурная і дынамічная сістэма[1]. У спецыяльным параграфе «Национальная идея: актуальна ли она сегодня?» аўтар паглыбляецца ў вытокі беларускай нацыі, фарміравання беларускай ідэі і дзяржаўнасці. У даследаванні падкрэсліваецца, што кожны народ на пэўнай гістарычнай ступені свайго развіцця прыходзіць да ўсведамлення самога сябе як сацыяльнай цэласнасці. Галоўнай сацыяльнай платформай фарміравання этнасу (пазней – нацыянальнасці) з'яўляецца духоўнае адзінства, якое ўзнікае з агульнасці эканамічнага жыцця, сацыяльных умоў, мовы, культуры і рэлігіі, якія выяўляюць самасвядомасць і саманазву народа.

Дзеля абгрунтавання і раскрыцця нацыянальнай ідэі, паказу яе актуальнасці ён звяртаецца да роданачальнікаў, тых, хто стаяў ля вытокаў беларускай ідэйнай плыні і шмат здзейсніў дзеля яе пашырэння ў беларускім грамадскім асяроддзі. Імкнучыся больш выразна паказаць, прычым абгрунтаваць не выпадковасць, а гістарычную заканамернасць беларускай нацыянальнай ідэі, аўтар неаднойчы прыводзіць творчыя здабыткі прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху, братоў Івана і Антона Луцкевічаў, Вацлава Ластоўскага, Ігната Буйніцкага, Аркадзя Смоліча, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Ігната Абдзіраловіча.

Так, звяртаючыся да творчасці Янкі Купалы, а менавіта да яго верша-гімна «А хто там ідзе?», у адказ на пытанне «А хто там ідзе, а хто там ідзе / У агромністай такой грамадзе?» Яўген Міхайлавіч справядліва сцвярджае, што менавіта ў гучным слове «беларусы» заключалася ў той час галоўная нацыянальна-аб'яднальная ідэя, якая ўскалыхнула самаасэнсаванне і дзяржаўнае станаўленне беларускага народа. «Значнасць і гучнасць купалаўскага гімна складалася ў тым, што ён надаў прыярытэт беларускасці, паколькі асноўны этнас у нашай

[1] *Бабосов Е. М.* Основы идеологии современного государства. Минск, 2004.

краіне – беларусы, ды і зямля, на якой яны жывуць, называецца Беларуссю. Побач з саманазвай, увасобленай у слове «беларусы», выбітны паэт рэльефна вылучыў і сацыяльнае імкненне беларускага народа – «людзьмі звацца». Я. Купала прадстаўляе ў сваім паэтычным светаўспрыманні беларусаў і Беларусь «у агромністай такой грамадзе», гэта азначае – у агульнабеларускім адзінстве і згуртаванасці»[1].

Дзеля ўсебаковага асэнсавання праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці Я. М. Бабосаў звяртаецца і да творчасці М. Багдановіча, дзе, як нам падаецца, знаходзіць цікавыя, напоўненыя роздумам аб будучыні беларускага народа ідэі. У творчай спадчыне маладога паэта-патрыёта ён выявіў даволі арыгінальны пасыл, што адзінства гістарычных каранёў беларусаў і рускіх «не дае падстаў лічыць беларусаў часткай рускага народа, а беларускую культуру – адгалінаваннем культуры рускай. І першае і другое ўяўляюць з'явы нацыянальна самабытныя, якія валодаюць толькі ім уласцівымі традыцыямі, спецыфічнымі асаблівасцямі. «Беларусы, – падкрэслівае М. Багдановіч, – не ўвабралі ў сябе цэлага мора фінскіх элементаў і не падпалі пад ўздзеянне татаршчыны, як велікарусы...». Таму створаная беларускім народам культура «была культурай самастойнай, а не варыянтам культуры вялікарускай; сапраўды ў асобе беларускага і вялікарускага народаў сустрэліся дзве самастойныя нацыянальна-культурныя велічыні, якія сфармаваліся і якія выраслі незалежна адна ад адной». Таму ён лічыў неабходным падкрэсліваць несумненную «самастойнасць беларускай нацыянальнасці і беларускай культуры»[2].

Падсумоўваючы нацыянальныя ідэйныя плыні Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, Яўген Міхайлавіч прыходзіць, на наш погляд, да фундаментальнай думкі, якая заслугоўвае самай станоўчай ацэнкі. Аўтар пераканаўча паказвае, што гэта не штучная і не выпадковая ідэя. Аналіз шматлікіх крыніц, у якіх маюцца ацэнкі і меркаванні аб асаблівасцях беларускага народа, яго духоўных шуканнях і памкненнях, калі ўявіць іх лінейна, яскрава сведчыць аб тым, што ёсць «пэўная логіка ў фарміраванні і развіцці беларускай нацыянальнай ідэі. Гэта ідэя не прыдуманая нейкім мысліцелем, паэтам ці прарокам, яна выспявае ў грамадскай свядомасці народа, у яго пачуццях, вераваннях, памкненнях і ўвасабляе яго нацыянальную самабытнасць.

У працэсе развіцця, узбагачэння і канкрэтызацыі беларускай нацыянальнай ідэі акцэнт пастаянна змяшчаецца ад сацыякультурнай арыентаванасці нацыянальнай самасвядомасці да арыентаванасці нацыянальна-дзяржаўнай. Нацыянальная ідэя ператвараецца ў жаданы ідэал як правобраз жаданага будучага, як пуцяводная зорка, якая свеціць, але не грэе, якая, тым не менш, паказвае шлях да будучыні, вядзе да мэты. А мэта гэта ў творах М. Багдановіча і іншых змагароў і носьбітаў нацыянальнай ідэі пазначаная цалкам пэўна і дакладна – дзяржаўная самастойнасць Беларусі»[3].

---

[1] *Бабосов Е. М.* Основы идеологии современного государства. С. 97–98.

[2] Тамсама. С. 99.

[3] Тамсама. С. 100.

# СОДЕРЖАНИЕ

**Предисловие** (*Данилов А. Н.*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Приветствия** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

*Мясникович М. В.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
*Стёпин В. С.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
*Абламейко С. В.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
*Каваленя А. А.* Акадэмік Яўген Міхайлавіч Бабосаў – узор шчодрасці, шырыні душы і шчырасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

## ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ НАУЧНОГО ПОЗНАНИЯ

*Шавель С. А.* Воображение как ядро творчества (к юбилею академика Е. М. Бабосова) . . . 24
*Бороноев О. А.* (Санкт-Петербург, Россия) Советский, белорусский и российский социолог 49
*Водопьянов П. А., Бурак П. М.* Мировоззренческая безопасность общества на путях преодоления глобальных вызовов и рисков . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
*Данилов А. Н.* Большая геополитическая игра: социология глобализации и интеграции 68
*Евелькин Г. М.* Антикризисное сознание как потенциал инновационного развития . . . . . 79
*Рубанов А. В.* Субъекты социальных процессов: теоретико-методологические основания исследования . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
*Храмцова Ф. И.* Феномен человека и антропо-космологический принцип эволюции . . . 96
*Хилько М. І., Кирик В. Л.* Життєдіяльність людини: моделі усталеного розвитку . . . . . . . 103
*Зеленков А. И.* Постчернобыльский синдром в социодинамике современной Беларуси: гуманитарный аспект . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
*Титаренко Л. Г.* НТР и технократизм как проблемы научного исследования . . . . . . . . . . 134
*Румянцева Т. Г.* Е. М. Бабосов о «необычных странствиях по петляющим тропам жизненной судьбы» К. Г. Юнга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
*Масленченко С. В., Рязанцева Т. В.* Вклад Е. М. Бабосова в формирование концептуальных основ идеологии белорусского государства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

## СОЦИАЛЬНЫЕ ТРАНСФОРМАЦИИ В СОВРЕМЕННОМ СОЦИУМЕ

*Ротман Д. Г.* Стабильность – основа улучшения качества жизни населения Беларуси . . . 160
*Лаптенок А. С.* Личность, культура, мораль в социальных системах . . . . . . . . . . . . . . . . 172
*Соколова Г. Н.* Состояние и использование человеческого капитала в Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
*Кечина Е. А.* Социолого-статистическое исследование: специфика и основные направления . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195
*Лазаревич А. А.* Наука и общество в глобальном измерении . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204

*Пунченко О. П.* (Украина) Проблемы научно-технической динамики в зеркале философской мысли академика Е. М. Бабосова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
*Клименко В. А.* Формирование общего научного и инновационного пространства стран СНГ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
*Щербин В. К.* Профессиональные институты научного сообщества как ключевой фактор наращивания социального капитала науки . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 231
*Волнистая М. Г.* Социальные системы и механизмы устойчивого развития в социологических исследованиях академика Е. М. Бабосова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 254
*Сендер А. Н.* Философско-методологические аспекты педагогической науки в трудах академика Е. М. Бабосова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269
*Смирнов В. Э.* Средний класс и его перспективы на постсоветском пространстве . . . . . . 272
*Мушта А. А.* Вооруженный конфликт на Востоке Украины: социологические и политологические наблюдения и выводы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 280
*Лапина С. В.* Особенности белорусской научной школы в области социологии . . . . . . . . 288
*Бабосова Е. С.* Государственная молодежная политика и ее роль в процессе обеспечения устойчивого развития Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 294
*Лихачева С. Н.* Молодежь как субъект социальной политики . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 309

## ТРАНСФОРМАЦИЯ ДУХОВНОГО МИРА ЧЕЛОВЕКА

*Легчилин А. А., Дудчик А. Ю.* Doctor universalis: Е. М. Бабосов как историк мысли . . . . . 316
*Гуцаленко Л. А.* Космологическая составляющая человеческого универсализма . . . . . . . 323
*Можейко М. А.* «Эротика текста»: нелинейная методология анализа текстуальной креативности в постмодернизме . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 333
*Безнюк Д. К.* Перспективы и противоречия межкультурного диалога в XXI веке . . . . . . 344
*Яскевич Я. С.* Национальные приоритеты в условиях глобальных рисков . . . . . . . . . . . . 349
*Мельникова Т. П.* О консолидирующей белорусской идее, отражающей базовые ценности нации, специфику менталитета, условия устойчивого развития и миссию современной Беларуси на геополитической арене . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 361
*Русецкая В. И.* Идентичность как проблема самоопределения современного человека . . . 374
*Комаровский А. В.* Феномен человеко(раз)мерности: философское и социологическое осмысление . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 382
*Мысливец Н. Л.* Развитие социологического образования как императив времени . . . . . . 392
*Назаренко Ю. С.* Трансформация образования и профессии в обществе знаний . . . . . . . 399
*Мартинковский М.* (Польша) Угрозы здоровью человека и общества в контексте глобализационных изменений . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 408
*Лихачев Н. Е.* Духовная культура белорусских сельчан: социологический ракурс (ориентируясь на методологию Е. М. Бабосова) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 421
*Криштапович Л. Е.* Мыслитель прометеевского масштаба . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 428
*Бубнов Ю. М.* Уроки академика Е. М. Бабосова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 437
*Кирвель Ч. С., Романов О. А.* Хозяин своей судьбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 440
*Бузук Р. Л.* Размышления у театрального подъезда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 444

## ЛИЧНОЕ И НЕ ТОЛЬКО…

*Слука О. Г.* Философская поэма академика Е. М. Бабосова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 450
*Мамедов А. К.* (Москва, Россия) К юбилею друга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 460
*Никитенко П. Г.* Штрихи к портрету ноосферной личности академика Евгения Михайловича Бабосова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 463
*Шейнов В. П.* «Я горжусь знакомством с этим Человеком» (впечатления от встреч с выдающейся Личностью) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 465

*Малевич И. А.* Он тоже «родом из детства» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 471
*Молочко В. И.* Просто Женя Бабосов . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 476
*Прокошин В. И.* Государственно-организационная деятельность по совершенствованию управления наукой (60–70-е годы XX века) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 481
*Бембель-Зьніч Алег.* Яўген Бабосоў – і 58-ы артыкул КК СССР . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 489
*Кириенко В. В.* Евгений Михайлович Бабосов – наставник и соратник . . . . . . . . . . . . . . . 490
*Кикель П. В.* Личность по имени Учитель . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 497
*Самаль С. А.* Академик Е. М. Бабосов – человек государственный . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 499

**Краткая информация об авторах** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 502

Научное издание

**СОВРЕМЕННЫЙ СОЦИУМ
В МИРЕ ГЛОБАЛЬНЫХ ПЕРЕМЕН**

**к 85-летию академика Е. М. Бабосова**

Редактор *А. В. Волченко*
Художественный редактор *И. Т. Мохнач*
Технический редактор *О. А. Толстая*
Компьютерная верстка *О. Л. Смольской*

Подписано в печать 11.02.2016. Формат 70×100$^{1}/_{16}$. Бумага офсетная. Печать цифровая.
Усл. печ. л. 41,44+0,33 вкл. Уч.-изд. л. 36,7. Тираж 120 экз. Заказ 35.

Издатель и полиграфическое исполнение:
Республиканское унитарное предприятие «Издательский дом «Беларуская навука».
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя
печатных изданий № 1/18 от 02.08.2013. Ул. Ф. Скорины, 40, 220141, г. Минск.